**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”**

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускага мовазнаўства

**Крышаловіч**

**Вольга Юр’еўна**

# Антрапонімы ў рамане Уладзіміра Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”

**Дыпломнае даследаванне**

**Навуковы кіраўнік –**

**кандыдат філалагічных навук,**

**дацэнт Лобань Н.П.**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

**Мінск, 2013**

## Рэзюмэ

Крышаловіч Вольга Юр'еўна

## Антрапонімы ў рамане Уладзіміра Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім"

Ключавыя словы: анамастыка, антрапонімы, імя, імя па бацьку, прозвішча, мянушка, канатацыя, функцыянальна-стылістычная роля.

Аб'ектам дыпломнага даследавання з'яўляецца мова рамана Уладзіміра Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім". Мэта працы - даследаванне асаблівасцей функцыянавання антрапанімічных адзінак ў рамане Уладзіміра Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім".

У дыпломнай рабоце выяўляюцца і сістэмна апісваюцца семантыка-стылістычныя асаблівасці антрапонімаў (асабовых уласных імёнаў, мянушак, прозвішчаў) у рамане Уладзіміра Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім", з'явы этымалагізацыі ў антрапанімічных адзінках мастацкага твора, вызначаецца ступень ужывальнасці і адметнасці выкарыстання разнавіднасцей онімаў у мастацкім творы, роля ўзуальных і аказіянальных сродкаў у стварэнні канатацыйных значэнняў антрапонімаў у рамане Уладзіміра Караткевіча.

Вынікі даследавання і асноўныя палажэнні дыпломнай працы могуць быць выкарыстаны пры далейшай распрацоўцы пытанняў, звязаных з вывучэннем семантыка-стылістычных асаблівасцей і з'яў этымалагізацыі антрапонімаў, ступеню ўжывальнасці і адметнасцей выкарыстання онімаў у мастацкім тэксце, канатацыйным значэннем антрапонімаў, і наогул антрапанімікону ў творах мастацкай літаратуры. Матэрыялы даследавання знойдуць сваё прымяненне пры распрацоўцы спецкурсаў па анамастыцы. Назіранні, праведзеныя ў працы, могуць быць карыснымі пры складанні слоўнікаў літаратурнай мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ